насць. Быццам гэта і меў на ўвазе А. Бачыла, пішучы пра застаялую ваду, якая «заснула ў твані чорнай нематы». Таму і атрымалася, што ў наш час чалавек вымушаны за сваю заспакоенасць і сацыяльна-грамадзянскую аморфнасць расплочвацца па вялікаму рахунку. І за кожную малую рэчку, і за Арал, і за Байкал... Галоўнае ж, паэзія беспамылкова ўбачыла, як разам са стратай нацыянальных каштоўнасцей у чалавеку адбыліся адмоўныя маральна-псіхалагічныя змены, а ў самім грамадстве — аддаленне ад жыццёва неабходных сацыяльна-экалагічнага і духоўна-экалагічнага ідэалаў. Яшчэ ў канцы 60-х гадоў Н. Гілевіч у вершы «Раўняюць хлопцы рэчку» прадбачліва заўважыў, што, выпростваючы раку і тым самым разбураючы адвечную плынь гарманічнага сужыцця з прыродай, мы становімся ахвярамі маральнай і эстэтычнай глухаты, наш уласны свет робіцца ў нечым істотным прамалінейна-бездухоўным, дэгуманізаваным, недаравальна збедненым. Малады паэт Л. Галубовіч з выпрамленнем ракі звязвае занядбанне нацыянальнай памяці: «А ўласныя парогі — Далёка ад дарогі, — За памяццю ракі»[14]...

Якраз таму мастакі лірычнага слова адчуваюць вострую патрэбу ва ўзбагачэнні пачуцця прыроды нашага сучасніка першароднай уражлівасцю, адухоўленасцю, адвечнай паэзіяй яднання з навакольным светам. Паэты спрабуюць глыбей пранікаць у нетры стагоддзяў, каб узнавіць экалагічную спадчыну мінулага і пашырыць светапоглядныя межы сучаснага чалавека, а таксама імкнуцца вылучыць прыцягальна-натуральнае, непераходнае ў нацыянальным і агульначалавечым вопыце. Дух старажытнай даўніны жывіць творчасць М. Танка, Р. Барадуліна, В. Зуёнка, Я. Сіпакова і іншых. «Толькі зірнуўшы назад, у сваё мінулае, чалавек у люстры сваім бачыць сваю ўласную прыроду»[15], — адзначаў М. Прышвін. «Мы ўсе крыху язычнікі», — лічыць і сённяшні малады беларускі паэт А. Пісьмянкоў. Дык ці ёсць шанс адрадзіць спаконвяковы ідэал экалагічнай гармоніі? Сучасная паэзія адказвае на гэта пытанне сцвярджальна і скіроўвае ўвесь свой грамадзянскі напал на тое, каб гэты ідэал стаў законам Будучыні ў з'яднанні чалавека і прыроды. Паэты настойліва дбаюць пра нашы вечныя зямныя і духоўныя крыніцы, якія наталяюць рэкі і азёры, жывяць чыстую плынь жыцця чалавека і прыроды.

«Пі, як продак піў, — / з крынічкі, Кожнай кропляй даражы![16]» Гэтыя словы А. Пісьмянкова, бадай, можна ўспрыняць як шчыры, палкі заклік да мацавання гарманічнага, дружалюбнага супольніцтва з Прамаці-прыродай.

[1] Гегель Г. В. Эстетика: В 4 т. М., 1968. Т. 1. С. 172.
[2] Осетров Е. И. Книга о русской поэзии. М., 1982. С. 312.
[3] Маркс К., Энгельс Ф. Из ранних произведений. М., 1956. С. 564—565.
[4] Танк Максім. Хай будзе святло. Мінск, 1972. С. 76.
[5] Мятліцкі Мікола. Шлях чалавечы. Мінск, 1989. С. 63.
[6] Зуёнак Васіль. Маўчанне травы. Мінск, 1980. С. 188.
[7] Макаль Пятрусь. Дотык да зямлі. Мінск, 1975. С. 6.
[8] Вялюгін Анатоль. Выбраныя творы: У 2 т. Мінск, 1984. Т. 2. С. 5.
[9] Циолковский К. Э. Будущее Земли и человечества. Калуга, 1928. С. 4.
[10] Барадулін Рыгор. Свята пчалы. Мінск, 1975. С. 127.
[11] Гинзбург Л. Я. Литература в поисках реальности. Л., 1987. С. 89.
[12] Бічэль-Загнетава Данута. Ты — гэта ты. Мінск, 1976. С. 150.
[13] Танк Максім. За маім сталом. Мінск, 1984. С. 69.
[14] Галубовіч Леанід. Таемнасць агню. Мінск, 1984. С. 28.
[15] Пришвин М. М. Желанная книга. М., 1987. С. 361.
[16] Дзень паэзіі-88. Мінск, 1988. С. 110.

П. І. МАЛЯЎКА

## СУЧАСНАЯ БЕЛАРУСКАЯ П'ЕСА

### (да пытання разнавіднасцей камедыйнага жанру)

Сучасная беларуская камедыя мае значныя здабыткі. Пацвярджэннем таму з'яўляюцца творы, напісаныя па законах такіх традыцыйных форм камедыйнага жанру, як сатырычная і сацыяльна-бытавая камедыя («Пагарэльцы», «Верачка» А. Макаёнка, «Амністыя» М. Матукоўскага, «Злыдзень», «Укралі кодэкс» А. Петрашкевіча, «Аперацыя «Мнагажэнец», «Гіпапатам» А. Дзяլендзіка). Беларускія камедыёграфы, асабліва К. Крапіва і А. Макаёнак, пазнаёмілі грамадскасць з п'есамі, незвычайнымі па жан-

раваму вызначэнню: філасофская, фантастычная камедыя «Брама неўміручасці», трагікамедыя, народны лубок «Трыбунал», камедыя-рэпартаж «Таблетку пад язык». Варта спыніцца і на сатырычным памфлеце, і на фарсе-вадэвілі, а таксама на лірычнай камедыі, паколькі жанравая разнавіднасць апошняй крытыкамі вызначаецца даволі неакрэслена, невыразна.

Лірычная камедыя прадстаўлена нешматлікімі творамі паасобных пісьменнікаў. Часта звяртаецца да гэтай разнавіднасці камедыйнага жанру К. Губарэвіч. Яго лірычныя камедыі «Салодкі месяц», «Ох, «Жыгулі», вы, «Жыгулі»!» закранаюць маральна-этычныя праблемы рэчаіснасці. Па законах лірычнай камедыі, насычаных у пэўнай ступені элементамі драмы, напісаны п'есы «Залаты медаль», «Экзамен на восень» І. Шамякіна. «Амазонкі» А. Дзялендзіка таксама можна аднесці да лірычнай камедыі, хоць у ёй нямала і характэрных рыс вадэвіля, у прыватнасці сцэны з танцамі, музыкай, забаўнымі прыгодамі. У цэнтры твораў — прадстаўнікі малодшага пакалення.

У літаратуразнаўстве няма адзінай думкі наконт такой разнавіднасці камедыйнага жанру, як лірычная камедыя. Адны яе прызнаюць, другія імкнуцца абысці гэтае спрэчнае пытанне. Слушныя выказванні, абгрунтаваныя тлумачэнні аб дадзенай разнавіднасці камедыйнага жанру ёсць у працах А. Гарбуновай, В. Сахноўскага-Панкеева, Я. Усікава, С. Лаўшука.

Напрыклад, Я. Усікаў дае такое вызначэнне. «Наяўнасць дзвюх сфер — лірычнай і камічнай, перапляценне ўзвышанага і штодзённага, сур'ёзнага і смешнага, добрага і благога, спалучэнне паэзіі жыцця з прозай, зліццё пафасу сцвярджэння з пафасам адмаўлення — вось што характэрна для лірычнай камедыі»[1]. Такое вызначэнне можна аднесці не толькі да лірычнай камедыі, але і да прозы, паэзіі. На думку С. Лаўшука, «лірычная камедыя займае прамежкавае становішча паміж вадэвілем і бытавой камедыяй, у адпаведных прапорцыях сінтэзуючы жанравыя адметнасці абодвух»[2].

Вядома, у лірычнай камедыі могуць выяўляцца і элементы вадэвіля, і элементы бытавой камедыі і іншых разнавіднасцей камедыйнага жанру. І тым не менш «...крытэрыем мастацкасці ў дадзеным выпадку паслужыць мера і мэтазгоднасць выкарыстання сродкаў прозы або лірыкі, а не сам факт прыцягнення або адмаўлення іх»[3]. Такім чынам, «уключаючы эпічныя і лірычныя элементы ў п'есу, драматург узбагачае яе ідэйна-эстэтычны змест і робіць гэта ў адпаведнасці са спецыфічнымі асаблівасцямі драматычнага роду паэзіі»[4].

Без лірычнага пачатку, без лірычнай плыні на працягу ўсяго ходу дзеяння немагчыма стварыць лірычную камедыю. Лірызм — дамінанта лірычнай камедыі, а ў якіх эстэтычных формах лірычны элемент праяўляецца ў п'есе, залежыць ад майстэрства аўтара, яго творчай індывідуальнасці. Выкарыстанне ў п'есе элементаў лірыкі дапушчальна ў адпаведных межах, калі гэтага патрабуе само дзеянне, абмалёўка характараў, а галоўнае — вырашэнне пастаўленай праблемы. Да таго ж, «...калі мы гаворым аб лірычнай камедыі, то маем на ўвазе твор, у якім расказваецца аб тонкіх душэўных перажываннях, аб глыбока асабістых пачуццях, аб каханні»[5].

Асноўная сюжэтная лінія п'есы «Ох, «Жыгулі», вы, «Жыгулі»!» — інтымная. Яна звязвае ў адзіны клубок усе персанажы. У творы простыя, амаль вадэвільныя сітуацыі, якія развіваюцца лёгка і непасрэдна. Камедыя прасякнута мяккім гумарам, які ўласцівы ўсім персанажам. У цэнтры яе — перадавы механізатар калгаса Іван Кудзеля. Аўтар не ідэалізуе яго, а абмалёўвае ўсебакова, з уласцівымі Івану станоўчымі і негатыўнымі рысамі характару. «Задзірыстым» паўстае ён у пачатку п'есы, а ў фінале поўнасцю выпраўляецца. «Станоўчым дзеяннем» у «выпрамленні» вядучага персанажа з'яўляецца праца. Такі прыём характэрны амаль для ўсіх лірычных камедый аўтара. Аднак у п'есе «Ох, «Жыгулі», вы, «Жыгулі»!» не толькі праз грамадска-карысную працу, але і шляхам шчырых, сяброўскіх узаемаадносін з Алёнай адбываецца духоўнае пасталенне Івана. Гэтым самым драматург прыводзіць да думкі, што паэзія працы разам з паэзіяй высокіх пачуццяў становіцца тым фактарам, які садзейнічае выхаванню новага чалавека камуністычнага грамадства.

І ў п'есе «Ох, «Жыгулі», вы, «Жыгулі»!» К. Губарэвіча, і ў «гарэзлівай» (па вызначэнню аўтара) камедыі «Амазонкі» А. Дзялендзіка закранаюцца важныя маральна-этычныя праблемы выхавання нашага сучасніка. У п'есе «Амазонкі» камедыёграф паставіў на парадак дня пытанні аб любові і ўзаемаадносінах у сучаснай сям'і. Амаль усе сцэны камедыі маюць лірычную танальнасць. Мове персанажаў уласцівы гумар, метафарычнасць,

дыялогі вылучаюцца рэзкай палемічнасцю. Якая роля мужчыны і жанчыны ў мікраклімаце сучаснай сям'і? У чым іх ідэал? Аб гэтым страсна спрачаюцца ўсе дзеючыя асобы твора. Іх вывады шчырыя, праўдзівыя, пераканаўчыя. Вось, напрыклад, адна са сцэн п'есы: «**Дзяніс.** Але паслухайце, мудрэйшая, і мае прэтэнзіі да сучаснай жанчыны — прыглушваюцца адвечныя жаночыя якасці: адчувальнасць, мяккасць, гаспадарлівасць, цяга да ўтульнасці. Таму і эмацыянальны клімат сям'і становіцца больш жорсткім, рацыянальным, знікаюць нейкія паўтоны... Таму ў бедах цяперашніх сем'яў вінаваты і мужчыны, і жанчыны. Разам пашукаць бы выйсце»[6].

У дадзеным выпадку вуснамі аднаго са станоўчых персанажаў выражана галоўная думка твора. Але камедыёграф ідзе далей, глядзіць на жыццё шырэй, імкнецца пранікнуць глыбей у складаны свет сям'і, адшукаць прычыны, якія папярэднічаюць такой негатыўнай з'яве, як недаўгавечнасць у сямейным саюзе, халоднасць, абыякавасць ва ўзаемаадносінах. На думку аўтара, усё пачынаецца з любові. Аб гэтым гаворыць самая юная гераіня ў п'есе Зоя: «..Мы чакаем вас... Мы так чакаем вас. Шмат гадоў. Як свята! А вы... У сне бачым... А вы ходзіце — шэранькія, з вузкалобым інтарэсам... Ведаеш (Сярожу), што высякаў на камні дзікун, першабытны чалавек? Не галаву, не вочы жанчыны, а, мякка кажучы, сцёгны... Чорт з імі, з птушкамі! Ідзі да мяне! Ведаеш? Чорт з імі, з птушкамі, кветкамі, каханнем, пяшчотнасцю... І што застанецца?»[7]

У параўнанні з лірычнай камедыяй К. Губарэвіча «Ох, «Жыгулі», вы, «Жыгулі»!» у п'есе «Амазонкі» А. Дзялендзіка персанажы вырашаюць праблему больш маштабную. Увогуле, у лірычных камедыях К. Губарэвіча пытанні маральнага выхавання раскрываюцца вузей, у іх дзейнічаюць персанажы з недахопамі, часам нават істотнымі. І тым не менш у п'есах такой разнавіднасці камедыйнага жанру дзеючыя асобы духоўна сталеюць, перавыхоўваюцца, не застаюцца страчанымі для грамадства. У лірычнай камедыі А. Дзялендзіка — ідэнтычны працэс, хоць яшчэ нават у фінале незразумела, ці зробяць правільныя вывады Барыс і Дзяніс з «маральнага ўрока» «амазонак». Не пазбаўлены лірычныя камедыі абодвух аўтараў і пэўных недахопаў. У прыватнасці, сустракаюцца непатрэбныя сцэны, напісаныя хутчэй толькі для знешняй маштабнасці твора, не заўсёды гумар персанажаў адпавядае сітуацыям, учынкам. І ўсё ж, нягледзячы на ўласцівыя камедыям недахопы, яны абагацілі беларускую драматургію.

У жанрава-стылявых адносінах п'еса А. Макаёнка «Дыхайце эканомна» розніцца з усімі папярэднімі, нават з тымі, у якіх аўтар бязлітасна выкрывае мараль, права і закон буржуазнага грамадства. З першых старонак твора мы становімся як бы непасрэднымі ўдзельнікамі падзей. І самае галоўнае, што менавіта маналогі і дыялогі дзеючых асоб трымаюць нас увесь час у напружанні, прымушаюць аналізаваць кожную рэпліку, кожнае слова. Знаёмячы па чарзе з уладалюбцамі розных эпох і часоў, А. Макаёнак ставіць нас перад фактам, што іх жыццёвая ідэалогія, іх палітычны лад грунтуюцца на бязлітаснай эксплуатацыі большасці меншасцю. Звяртае на сябе ўвагу і тое, што ў творы гісторыя развіцця чалавечага грамадства паказваецца ў адваротнай храналагічнай паслядоўнасці: ад нашай рэчаіснасці і да зараджэння чалавечай цывілізацыі. Прынамсі, у сувязі з гэтым камедыёграф сканцэнтроўвае ўвесь арсенал сваіх сатырычных сродкаў на выкрыцці эксплуататараў розных эпох і масцей. Усе яны (і Прэзідэнт, і Адольф, і Людовік, і Фарыд, і Хіра Сіта, і іншыя), атрымаўшы ўладу, бязлітасна эксплуатавалі працоўных. Драматург падкрэслівае, што для дасягнення сваіх карыслівых мэт яны, у першую чаргу Прэзідэнт і яго акружэнне, не спыняцца ні перад чым, нават перад пагібеллю цэлых народаў, пагібеллю чалавечай цывілізацыі ўвогуле. Гэта выразна прачытваецца з маналога Прэзідэнта: «...Шаноўныя! Што жахліва? Вам страшна жыць? Чаму кашмар? Дзе кашмар? Там — вы думаеце — саладзей? Вам захавалі жыццё? А там зараз гіне ўсё чалавецтва! Усю планету кінулі вам у ахвяру! Кашмар, пекла зараз там... Вас я сабраў, каторыя павінны ўцалець, як самая чыстая парода, эліта... Лад жыцця ў нас будзе такі: строга і няўхільна прытрымлівацца нашага галоўнага прынцыпу — недатыкальнасці прыватнай уласнасці... Мы спынілі цывілізацыю на гэтым месцы і не дазволім нікому зрушыць нас ва векі вякоў..»[8]

З-пад увагі А. Макаёнка не выпаў і той факт, што ў лагеры эксплуататараў-уладалюбцаў ніколі не бывае міру і ўзаемаразумення. Усё і ўсіх яны кінуць у пекла, каб толькі ўсталявацца на троне. У гэтым сэнс эпіграфа да першай дзеі п'есы.

З самага пачатку твора выразна акрэсліваецца яго філасофска-інтэлектуальная накіраванасць, шырокі сацыяльна-грамадскі фон. З гэтым звязана непасрэдна і ўзмацненне публіцыстычных элементаў, якія ўзбагачаюць стыль п'есы. І ўвогуле мова персанажаў моцна насычана палітычнай лексікай. Але гэта ніколькі не зніжае мастацкасці твора. Наадварот, характары дзеючых асоб атрымаліся жыццёва-праўдзівымі, пераканаўчымі. Элементы публіцыстыкі пачынаюць займаць першараднае месца ў маналогах і дыялогах ужо ў другой дзеі і дамінуюць у фінале п'есы, а паралельна гэтаму адчуваецца страсная пазіцыя аўтара ў абарону ўсяго жывога на зямлі. Яна па-майстэрску акрэсліваецца ў другой дзеі твора (эпіграфе), а таксама праз сцверджанне прадстаўніка навукі (Кейта), выказанае ў заключнай карціне: «**Кейт.** Не! Не дапусцім! Нават калі на планеце (паказвае на Біма і Крошку) іх было б толькі двое, то і тады варта ратаваць мір»[9].

Па асаблівасцях жанру п'еса «Дыхайце эканомна» набліжаецца да вострага сатырычнага, палітычнага памфлета, у якім выкрываецца маральнае ўбоства, дэградацыя гандляроў смерцю, а таксама — да агітп'есы, горача заклікаючай да барацьбы за мір, за непарушнасць прынцыпаў існавання чалавечай цывілізацыі.

У фарсе-вадэвілі Г. Марчука «Вясёлыя, бедныя, багатыя» («Дэфіцытны жаніх») асноўная тэма твора — выкрыццё сучаснага мяшчанства, заган жыцця на матэрыяле вясковай рэчаіснасці. Раскрыццё сутнасці чалавека ў творы камедыёграфа адбываецца ў складаным коле грамадскіх праблем. Адкрытая самахарактарыстыка некаторых персанажаў, прызнанне і заява іх аб сваіх дзеяннях і намерах з'яўляецца адным з прыёмаў, якія ўласцівы вадэвілю. Разгортванне сцэнічнай інтрыгі, выкарыстанне масавых сцэн, прысутнасць вульгарызмаў і варварызмаў у мове персанажаў пераключаюць твор у фарсава-вадэвільны план. Менавіта жанравая прырода фарсу-вадэвілю, яго лёгкасць, дасціпнасць і нібы павярхоўнасць не засланяюць у п'есе першаснага, галоўнага — сур'ёзнасці яе сатырычнага прыцэлу. У ёй выразна спалучаюцца рысы сацыяльна-бытавой камедыі і элементы фарсу-вадэвілю, камедыі нораваў і сатырычнай камедыі. Яе смех — гэта і здзеклівая сатыра, і іронія, і гратэск, і сарказм, усё тут знаходзіць сваё месца. Асабліва гэта датычыцца абмалёўкі галоўнага персанажа твора — Роберта Тушканчыкава, вобраз якога падаецца найбольш буйным планам. Яўны прайдзісвет і хапуга, «аматар» лёгкага рубля, які прывык жыць за кошт працы іншых, ён з тых людзей, якія дзейнічаюць па прынцыпу: ты — мне, я — табе. Маскіруецца Тушканчыкаў пад хворага і ў той жа час — вельмі «вучонага» чалавека з адзінай мэтай: абагаціцца за кошт працы сумленных, працавітых савецкіх людзей. Пэўнага прыстанішча ў яго няма: «...Я чалавек зямлі. Куды мяне лёс зафугасіць — там і радзіма»[10].

Ключавым у стварэнні камічнага эфекту ў творы з'явілася іронія, іранічнае падколванне героя, падсмейванне спадцішка, паступовая падводка яго да краху. Багаты падтэкст бачны ў словах дзеда Лукі, які адным з першых распазнаў у Роберце хапугу і прыстасавальніка: «Пра сябе ён дбае. Калі вы канчаткова пазбавіцеся любві да бацькаўшчыны, яму ж лягчэй будзе вас дурыць. Апамятайцеся, людзі! Вас паасобку прывучаюць ганяцца за доўгім рублём, і страціце вы цікавасць да брата вашага і маці, сястры, суседа...»[11] Гэтымі словамі камедыёграф акцэнтуе нашу ўвагу на той небяспецы, якую прыносяць грамадству такія «дзеячы», як Роберт Тушканчыкаў.

Такім чынам, у п'есах беларускіх драматургаў глыбока і праўдзіва адлюстроўваюцца найбольш значныя працэсы аб'ектыўнай рэчаіснасці, усебакова раскрываецца ўнутраны свет герояў, нашых сучаснікаў.

[1] Усікаў Я. Беларуская камедыя. Мінск, 1973. С. 10.
[2] Лаўшук С. Сучасная беларуская драматургія. Мінск, 1977. С. 142.
[3] Горбунова Е. Вопросы теории реалистической драмы. М., 1963. С. 457.
[4] Там жа. С. 456.
[5] Сахновский-Панкеев В. О комедии. Л.; М., 1964. С. 183.
[6] Дзяленд зік А. Аперацыя «Многажэнец». Мінск, 1981. С. 93.
[7] Там жа. С. 119.
[8] Макаёнак А. Дыхайце эканомна // Беларусь, 1983. № 9. С. 14.
[9] Там жа. № 10. С. 18.
[10] Сучасная беларуская п'еса. Мінск, 1985. С. 253.
[11] Там жа. С. 274.